ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навукова-метадычнай рабоце РІВШ
_____________ І.У.Цітовіч
«_23_» ___02_____ 2016 г.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ
## навукова-метадалагічнага семінара кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы ад 23 лютага 2016 г.

23 лютага 2016 г. адбыўся навукова-метадалагічны семінар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі РІВШ, прысвечаны постаці Тадэвуша Рэйтана (1740–1780) і яго ролі ў гісторыі Беларусі другой паловы XVIII ст.

**У навукова-метадалагічным семінары прымалі ўдзел** прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, аспіранты кафедры, слухачы спецыяльнасці перападрыхтоўкі "культуралогія", беларускія гісторыкі і запрошаныя эксперты: А.А. Жлутка (кандыдат філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі), В.В. Гарбачова (кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў БДУ), З.Ю. Юркевіч (даследчык, краязнаўца, старшыня Арт-суполкі імя Тадэвуша Рэйтана), А.М.Сцебурака (кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры бізнэс-камунікацый ІБМТ БДУ);

**Заключэнне навукова-метадалагічнага семінара:**

- Паходжанне, жыццё і дзейнасць Тадэвуша Рэйтана непасрэдна звязаныя з яскравымі падзеямі беларускай гісторыяй і таму мы маем права разглядаць яго як асобу, што прэтэндуе на статус нацыянальнага героя Беларусі.
- Дзейнасць роду Рэйтанаў у Беларусі прасочваецца з першай траціны XVII ст. Ён парадніўся са значнай колькасцю старабеларускіх шляхецкіх родаў і прадстаўнікі роду Рэйтанаў актыўна ўдзельнічалі ў палітычным, культурным і ваенным жыцці краіны.
- Станоўчая гістарычная роля дзейнасці Т. Рэйтана з'яўляецца бясспрэчным фактам. У прыватнасці, яго самаахвярная абарона незалежнасці дзяржавы на сойме 1773 года.
- Значнасць асобы Т. Рэйтана можа быць ўшанавана на дзяржаўным узроўні, што павінна рэалізавацца ў выглядзе надання вуліцам, плошчам, скверам, навучальным установам, маладзёжным арганізацыям ганаровага імя Т. Рэйтана.
- Выклікае занепакоенасць няпэўнасць лёсу радавой сядзібы Рэйтанаў – Грушаўкі (Ляхавіцкі раён, Брэсцкая вобл.), якая знаходзіцца ў аварыйным стане і рыхтуецца да продажу з аўкцыёна. Безумоўна, яна павінна стаць дзяржаўным музеем-запаведнікам і тым самым спрыяць выхаванню патрыятызму ў грамадзян Рэспублікі Беларусь.

**Старшыня навуковага–метадычнага семінара:**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
загадчык кафедры гісторыка-культурнай
спадчыны Беларусі РІВШ С.Ф.Шымуковіч